Таким образом, в соответствии с Избирательным кодексом Республики Беларусь обеспечение общественного порядка во время выборов возлагается на местные органы управления и органы внутренних дел. Кандидаты и их доверенные лица обязаны им содействовать. Но, как уже отмечалось, сохранение правопорядка во многом зависит не только от правоохранительных органов, но и от правомерного поведения самих граждан, что создает предпосылки для нормального функционирования гражданского общества, его благополучия и поступательного развития.

УДК 342.4(476)+808

*В.К. Мароз, П.А. Капіца*

**КАНСТЫТУЦЫЙНЫ АСПЕКТ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ**

У XX ст. беларуская мова стала аб'ектам дзяржаўнай палітыкі. У 90-я гг. XX ст. суверэнная Рэспубліка Беларусь пачала ствараць заканадаўчую базу, якая юрыдычна замацавала курс на адраджэнне нацыянальнай мовы. Следам за прынятым 26 студзеня 1990 г. яшчэ ва ўмовах Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі законам «Аб мовах у Беларускай ССР» былі прыняты законы «Аб культуры» (ад 4 верасня 1991 г.), «Аб адукацыі» (ад 26 кастрычніка 1991 г.). У адпаведнасці з дзяржаўнай праграмай была разгорнута сетка беларускіх нацыянальных школ. У вучэбных праграмах значная роля адводзілася вывучэнню беларускай мовы, а праз некалькі год гэты курс стаў абавязковым для вывучэння і ў ВНУ. Але ўсё гэта не ў поўнай меры паспрыяла адраджэнню беларускай нацыянальнай мовы, павышэнню яе нацыянальнальнага прэстыжу. Да сёння працягваюцца спробы вырашэння праблемы поліфункцыянальнага пашырэння дзяржаўнай беларускай мовы пераважна толькі ў межах вучэбнага працэсу, што, відавочна, з'яўляецца недастатковым. Дзяржаўнае функцыянаванне беларускай мовы немагчыма без усведамлення правоў і абавязкаў, замацаваных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (арт. 1, 17, 50). Яны даюць магчымасць прыйсці да адказу, чаму вучыцца па-беларуску, пісаць і гаварыць па-беларуску – гэта і неад'емнае канстытуцыйнае права, і неад'емны абавязак.

У арт. 2 «Дзяржаўная мова, іншыя мовы ў Беларускай ССР» закона «Аб мовах у Беларускай ССР» было засведчана: «У адпаведнасці з Канстытуцыяй (Асноўным Законам) Беларускай ССР дзяржаўнай мовай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі з'яўляецца беларуская мова.

Беларуская ССР забяспечвае ўсебаковае развіццё і функцыянаванне беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця.

Беларуская ССР забяспечвае права свабоднага карыстання рускай мовай як мовай міжнацыянальных зносін народаў Саюза ССР.

Беларуская ССР праяўляе дзяржаўны клопат аб свабодным развіцці і ўжыванні ўсіх нацыянальных моў, якімі карыстаюцца насельнікі Беларусі».

У арт. 17 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь запісана: «Дзяржаўнымі мовамі ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца беларуская і руская мовы».

Паколькі ў сучасных умовах асноўны клопат захавання беларускай нацыянальнай мовы і яе паўнавартаснага развіцця кладзецца на сістэму адукацыі, то неабходна клапаціцца пра пашырэнне пазнавальнай функцыі беларускай мовы, пра запатрабаванасць яе эстэтычнай і камунікатыўнай функцый. Варта прадугледзець выкарыстанне прыёмаў камунікатыўнага характару, што будзе спрыяць пераходу навучэнцаў з пасіўных слухачоў у актыўных носьбітаў мовы. Надзвычай важна давесці, што беларуская мова – неад'емны фактар творчага праяўлення і развіцця ў любой спецыяльнай прафесійнай сферы, незалежна ад таго, якая камунікатыўная сістэма пераважае ў грамадстве сёння. Ад рэальнага стану нацыянальнай дзяржаўнай мовы ў Рэспубліцы Беларусь залежыць умацаванне сфераў сучаснай беларускай навукі, культуры і народнай гаспадаркі. З навучэнцамі важна арганізаваць канструктыўную дыскусію пра асноўныя прычыны звужэння функцый беларускай літаратурнай мовы: пазнавальнай (навуковай і адукацыйнай), эстэтычнай, камунікатыўнай. У праблемна-арыентаваным кантэксце, які прадугледжваецца методыкай інавацыйнай дзейнасці, можна абмеркаваць пытанне, ад чаго Янка Купала перасцерагаў беларусаў яшчэ ў пачатку XX ст., напісаўшы ў артыкуле «Ці маем мы права выракацца роднай мовы» наступнае: «Для мовы, для гэтай выразіцелькі душы і думак чалавека, не патрэбна ні скіпетраў, ні каронаў, як не патрэбна для сонца якога-небудзь яшчэ пазалочанага абручча, рамак. Сонца само па сабе адна аздобнасць – і золата, і брыльянт. Таксама і мова якога-небудзь народа ёсць для яго і скіпетрам, і каронай, яго нічым не апаганенай аздобнасцяй».

У сувязі з гэтым важна, каб у адукацыйным працэсе атрымала распаўсюджанне методыка інтэрактыўных формаў – ад простых пытанняў да рэфератыўных, дыскусійных. Так, блок тэмаў, звязаных з гістарычнымі этапамі развіцця беларускай мовы, павінен змяшчаць параўнальны аналіз карт этнічнага рассялення беларусаў на працягу двух апошніх стагоддзяў; рэфератыўнае паведамленне пра функцыянаванне беларускай мовы ў якасці афіцыйнай у ВКЛ і дзяржаўнай у сучасных ўмовах; вуснае абмеркаванне тэмы «Беларуская мова ў кантэксце афіцыйных вынікаў перапісу насельніцтва Беларусі 2009 г.». Папярэднічаць такой працы ў групе павінна анкетнае апытанне ці тэматычная творчая праца. У пісьмовых творчых працах ці вусных разважаннях навучэнцаў знаходзяць адлюстраванне ўсе пытанні, актуальныя не толькі ў іх асяроддзі, але і ў грамадстве наогул: «Родная мова павінна знаходзіцца вакол нас ад самай калыскі, ад першых дзён маленства, ад мовы бацькоў, сяброў і знаёмых і яшчэ глыбей – ад продкаў, імя якім легіён. Яе і наша будучыня – у зберажэнні. Зберагчы мову – не згубіць яе носьбітаў». «Мову немагчыма спаліць, зламаць, разбіць, як, напрыклад, выявы мастацтва, архітэктуры, скульптуры, яе можна толькі страціць. Але мера гэтай страты – страта народа, нацыі, этнасу». «Родная мова – наш несмяротны дар. На жаль, не заўсёды людзі разумеюць, як многа хаваецца ў гэтых словах. Для адных Родная мова – гэта нейкая ўмоўнасць, толькі сродак зносін, нешта нежывое, без чаго можна пражыць, гаворачы на іншай мове. Для другіх жа голас Роднай мовы – гэта нібыта голас маці, гэта крыніца духоўнага жыцця, гэта як неба над чалавекам, гэта крылы, нададзеныя нашым марам, гэта водгук нашай душы». «Мне здаецца, што, калі знікне беларуская мова, знікне і сама назва Беларусь, а гэта значыць, што знікнуць і самі людзі, беларусы. Ці да гэтага трэба імкнуцца? Чаму стан беларускай мовы, які існуе на сёняшні дзень, не выклікае ў некаторых людзей ніякіх пачуццяў суперажывання, сораму і жадання дапамагчы выратаваць Родную мову? А ўсё таму, што душа ў наш час можа быць настолькі спустошана, што чалавек памірае ад смагі. Але ж толькі нам па сіле здаволіць смагу. То і ўзнікае пытанне: ці жадае гэтага сам чалавек, беларус? Можа, варта задумацца, што неяк недарэчна паміраць ад смагі, калі побач стаіць шклянка гаючай вады?». «І калі пагадзіцца, што ва ўсіх жыхароў краіны раптам не стала б душы, а яны ўсе ператварыліся б у камень, то тады сапраўдныя, сумленныя патрыёты, шчырыя абаронцы Радзімы і мовы ператварыліся б у каштоўны алмаз. І такім чынам дыямент мовы ў кароне Беларусі ніколі б не згас». На аснове такіх глыбокіх назіранняў у працэсе дыялогу паміж выкладчыкам і навучэнцам выпрацоўваецца рэальнае бачанне праблемы, шукаюцца спосабы, як уплываць на сітуацыю. Праз адкрыты дыялог, у аснове якога ляжыць самастойны пошук, можна высвятліць, ці павінна сучасная моладзь адчуваць адказнасць перад будучыняй за захаванне мовы, ці з'яўляецца гэта грамадзянскім абавязкам прадстаўнікоў карэннай нацыі на беларускай этнічнай тэрыторыі.

На наш погляд, выкладанне дысцыпліны «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» на аснове прыведзенай методыкі будзе забяспечваць не толькі поўнае і ўсебаковае авалоданне прафесійнай лексікай, але і выхоўваць нацыянальную самасвядомасць на аснове павагі да беларускай мовы як найвялікшага нацыянальнага скарбу. Пазнанне мовы як з'явы грамадскай дае магчымасць навучэнцам акрэсліць і ўмацаваць уласную прафесійную і грамадзянскую пазіцыю. Паглыбленне ў пазнанне роднай мовы абуджае творчы патэнцыял, развівае патрыятызм.